# Тэндэнцыі аўтэнтыкі

## Якія тэндэнцыі засведчыла канферэнцыя фалькларыстаў

**З 24 па 26 красавіка ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў прайшла IX Міжнародная навуковая канферэнцыя "Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання (памяці этнаантраполага Зінаіды Мажэйка)".**

Дадзеная канферэнцыя цягам дзевяці гадоў з'яўляецца адзіным у рэспубліцы сістэмным інавацыйным навукова-практычным праектам па канцэптуальным даследаванні актуальных напрамкаў захавання, вывучэння, пераймання і папулярызацыі фальклору. Сёлета навуковая падзея праходзіла ў памяць Зінаіды Мажэйка — лаўрэата Дзяржаўнай прэміі краіны, доктара мастацтвазнаўства, этнамузыколага і аўдыявізуальнага антраполага, аўтара даследаванняў па экалогіі традыцыйнай культуры. У канферэнцыі ўзялі ўдзел 120 даследчыкаў з 10 краін (Беларусь, Расія, Украіна, Літва, Латвія, Славакія, Малдова, Польшча, Нігерыя, Кітай) і 15 фальклорных калектываў.

У час сустрэчы з адказнымі за розныя напрамкі даследчай і практычнай дзейнасці прадстаўнікамі аргкамітэта канферэнцыі — прафесарам Энгельсам ДАРАШЭВІЧАМ, загадчыкам кафедры этналогіі і фальклору Вячаславам КАЛАЦЭЕМ, этнафоназнаўцам Таццянай ПЛАДУНОВАЙ — былі агучаны наступныя пытанні.

**— Што, на погляд удзельнікаў канферэнцыі і на ваш асабісты, як непасрэдна знаёмых з Зінаідай Мажэйка, з'яўляецца прыярытэтным для фалькларыста XXI стагоддзя, калі зыходзіць з яе навуковага тэстаменту?**

**Э.Д.:** — Рубяжы, якіх беларусазнаўства сёння дасягнула, Мажэйка прадбачыла. Фальклор сёння даследаваны і пажанрава, і парэгіянальна, і ў зрэзе "жывога бытавання". Пажанрава ён апісаны ў 50-томным зборы "Беларуская народная творчасць" Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; парэгіянальна — у зборы "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў", аўтарскі калектыў якога на чале з вучаніцай Мажэйка Тамарай Варфаламеевай атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва; у зрэзе "жывога бытавання" — наша традыцыя фіксуецца на інтэрнэт-партале livingheritage.by. Сёння інфармацыя пра фальклор — у наяўнасці, але ў грамадстве няма дакладнага разумення, як з гэтай інфармацыяй працаваць — ні канцэптуальна, ні ўжыткова-тэхнічна. Мажэйка сцвярджала, што для якаснага вывучэння фальклору "неабходны экспедыцыі сацыялагічнага напрамку са стацыянарным даследаваннем найбольш спеўных вёсак метадам "уключанага назірання". Гэты антрапалагічны метад не толькі дае інфармацыю, але і накіроўвае даследчыка на абарону аб'екта даследавання (мясцовай традыцыйнай культуры), пошук шляхоў інтэграцыі фальклору ў сучаснасць. Ён не прымае "адваблевай фіксацыі".

**— У сувязі з гэтым, што можа параіць навука сёння фалькларыстам-практыкам, кіраўнікам творчых калектываў у напрамку методык пераймання фальклору?**

**В.К.:** — У рамках канферэнцыі былі праведзены майстар-класы з удзелам практыкаў і прадстаўнікоў Расійскага інстытута гісторыі мастацтваў. Насамрэч, методыка захавання фальклорнага мастацтва ў цяперашні час — досыць прапрацаваная з'ява. Такія рэчы, як "метад дэманстратыўнай антрапатэхнікі" (пераймание вусным шляхам ад носьбітаў традыцыі ці з аўдыя- і відэакрыніц) сёння — звычайная "дыдактычная руціна" на нашай кафедры. Таму тыя, хто тут вучыцца, — не толькі лаўрэаты міжнародных фальклорных фестываляў у Германіі, Швецыі, Харватыі, Расіі, Эстоніі, Латвіі, Літве і дыпламанты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі, але і дыпламанты Рэспубліканскага конкурсу навуковых работ студэнтаў... Іх высокі мастацкі ды аналітычны ўзровень — заканамерны і даўно прадказаны ў тэорыі канта-націі (шматканальнага ды шматуз-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

# не толькі



Аляксандр Кацікаў у Астравецкай раённай бібліятэцы.

пленэрах, самі таксама арганізавалі рэгіянальны фестываль "Вакальны капеж"…

ДШМ мае патрэбу ў папаўненні выкладчыцкага складу духавіком і піяністам. Перспектыва займець гэтых профі ёсць. Але цяжкасць можа ўзнікнуць пры забеспячэнні спецыялістаў жыллём. Што да парку інструментаў, то ў школе ён перыядычна абнаўляецца, грошы з бюджэту на гэтыя мэты выдзяляюцца, але, каб (па магчымасці) іх хапіла амаль усім, набыць за гэтую суму можна толькі тое, што танней, гэта значыць — тое, што было ў карыстанні. А выбарны акардэон пакуль так і не набыты. Пазабюджэтам школа павінна зарабіць за гэты год 90 мільёнаў рублёў. Штомесячная плата за навучанне складае ад 50 — 70 (у аграгарадках) да 100 і крыху вышэй тысяч рублёў.

Прапаную Кацікаву правесці ў школе майстар-клас. "Ігры на баяне цяпер я не ўзяўся б навучаць, — пачынае разважаць ён. — Бас-гітара тут не патрэбна... Можа, проста распавёў бы пра тое, якія вехі я прайшоў, каб апынуцца ў знакамітым ансамблі? Да чаго трэба быць гатовым псіхалагічна, узнімаючыся па шматлікіх творчых прыступках..."

## Падарунак хакеісту...

Раённая бібліятэка адразу здзівіла тым, што з вуліцы ў яе вядзе службовы ўваход, а цэнтральны знаходзіцца з адваротнага боку. Унутры дзве дзяўчынкі падлеткавага ўзросту шукаюць нешта на стэлажах (падгледзеў: яны спыніліся на... сучасным жаночым любоўным рамане ў кніжачцы невялікага фармату ў мяккай вокладцы). Прайшоўся паміж паліц з кнігамі. Адкрываю Ніла Гілевіча. Калі апошні раз бралі? 1998 год… Васіль Быкаў. З ім лепш: 2011-ы...

— Кнігі я выкарыстоўваў і па іх прамым прызначэнні, і як... шчыткі для гульні ў хакей! — смяецца Кацікаў. — За сезон на іх сыходзіла з паўсотні вокладак! Мама з... разуменнем ставілася да такога "варварства"... А хатняя бібліятэка ў нас была добрая: шмат падпісных выданняў, твораў класікаў беларускай літаратуры. Сёе-тое з яе перайшло ў маю сям'ю. І яшчэ я быў запісаны ў дзіцячую бібліятэку пры Доме культуры, некаторы час захапляўся фантастыкай. Бывала, захварэеш, тэмпература, а побач з ложкам — стос кніг… А чым глыбей занурваўся ў музыку, тым менш чытаў…

— А чаму аддае перавагу чытач у вашай установе? — пытаюся я ў бібліятэкара Наталлі Рабцавай.

— Старэйшае пакаленне — рознай літаратуры. А маладое — у асноўным той жа фантастыцы, дакладней — фэнтазі. Мне здаецца, гэта звязана і з узростам, і з тым, што сур'ёзная літаратура патрабуе да сябе сур'ёзнага стаўлення, часу. А адкуль тое ў сённяшніх падлеткаў на папяровую кнігу? Яны і ў школе загружаны, і камп'ютар замяніў ім усё… Але надыходзіць момант, калі ім трэба паступаць вучыцца далей, тады тыя, хто абраў гуманітарныя ВНУ, прыходзяць сюды па класіку.

У "раёнцы" запісана крыху больш за дзве тысячы чытачоў (кожны чацвёрты жыхар Астраўца!), на абанемент у сярэднім прыпадае каля сарака наведвальнікаў у дзень, пераважна — пенсіянеры. Кніжны фонд (частка каталога ўжо пераведзена ў электронны выгляд) абнаўляецца рэгулярна, у тым ліку ў літаратуры "хітовай". Пры райбібліятэцы функцыянуюць аб'яднанні па інтарэсах "Актыўнае даўгалецце" і "Званы госць". У апошні гурток я тут жа ў якасці госця "сватаю" Аляксандра Кацікава.

— Амаль тры гады таму я арганізаваў у школе сустрэчу колішніх педагогаў, прысвечаную 80-годдзю з дня нараджэння маёй мамы, — кажа ён. — Падрыхтаваўся грунтоўна. Прыйшлі людзі розных пакаленняў. Было пра што пагутарыць, што згадаць. Усім, здаецца, было цікава. Я адкрыты для любых прапаноў, каб толькі яны зыходзілі ад чыстага сэрца, а мерапрыемствы не насілі характар "абавязалаўкі" дзеля "птушачкі"…

Наконт рамонту я Наталлю Васільеўну моцна катаваць не стаў, яна ж паведаміла, што па меры развіцця горада, тэмп якога ўзрастае, бібліятэка, верагодна, пераедзе ў будучы Цэнтр вольнага часу і забаў. Памяшканне ёй выдзеляць вялікае, прасторнае…

Раён (па меншай меры, гэты, узяты асобна) "задушылі планам выканання платных паслуг", **якія выцягваюць ледзь-ледзь, па большай частцы — за кошт... канцэртаў поп-выканаўцаў.** У такой пагоні за зарабляннем грошай воляй-няволяй менш часу надаецца аўтэнтыцы, традыцыям… "Усіх грошай на культуру з яе ж дапамогай не заробіш" — гэтую фразу, пачутую ў райвыканкаме, я вылучыў для сябе чырвоным колерам.

## Колькі каштуе артыст?

Раённы дом культуры на пачатку гэтага года быў рэарганізаваны ў Раённы цэнтр культуры і народнай творчасці шляхам зліцця Цэнтра рамёстваў, Метадычнага цэнтра і сельскіх дамоў культуры.

— Памятаю, як у 1976-м у ДК выступаў тады нікому яшчэ не вядомы артыст Валерый Лявонцьеў… — згадвае Кацікаў. — Сам жа Дом культуры з'яўляўся цэнтрам культурнага жыцця горада. Бываючы сёння ў айчынных дамах, палацах культуры, бачу, што і цяпер культурнае жыццё віруе вакол іх. Я не аматар агулам крытыкаваць савецкі перыяд нашай гісторыі, але, як мне здаецца, матэрыяльна-тэхнічна цяпер такія ўстановы ў цэлым забяспечаны лепш. А вось наколькі змяніліся людзі, якія ходзяць у гурткі, ці сталі яны больш таленавітымі за сваіх папярэднікаў, меркаваць не бяруся. Вось людзей на планеце стала больш, але не ўпэўнены, што стала больш культуры...

Дастаткова яе ў кінаканцэртнай зале "Астравец", што ўваходзіць у структуру новага ўтварэння. Як нам распавяла дырэктар Цэнтра Наталля Літвін, аншлагі ў ім збіраюць не толькі расійскія выканаўцы, але і айчынныя: Дзмітрый Калдун, Вольга Плотнікава, "Дразды", "Aura", Саша Нэма, Іван Буслай, Аляксандр Звяровіч, Ядвіга Паплаўская і Аляксандр Ціхановіч. (Для цікаўных прывяду цэннік: Калдун за кожны з двух сваіх канцэртаў атрымаў па 60 мільёнаў рублёў, кошт білетаў на "Драздоў" вагаецца ад 50 да 70 тысяч.) Плануецца і будаўніцтва новай канцэртнай залы на тысячу месцаў — з усімі выгодамі для публікі ды артыстаў (старая змяшчае толькі 400 гледачоў, і, да прыкладу, грымёрак тут няма)... Дарэчы, на стале Наталлі Валер'еўны мы заўважылі плакат з анонсам выступлення Аляксандра Саладухі — вось ужо хто "біток" збярэ, напэўна! А вось ці назіраюцца "біткі" ў гуртках РЦКіНТ (іх тут больш за дваццаць — ад народнага хору ветэранаў працы да народнага тэатра)?..

— Заўсёды хочацца большага, — разважае дырэктар. — Праблема ў тым, што, пераехаўшы ў гэты будынак гадоў пяць таму, мы апынуліся далекавата ад цэнтра горада. Школьнікам не вельмі зручна сюды дабірацца. Дый школьнікі... Прыходзяць яны да нас, і не ў многіх з іх сапраўды гараць вочы. Навошта тады ідуць? Бацькі прымушаюць?..

Між тым Аляксандр Дзмітрыевіч і Наталля Літвін абмяркоўваюць магчымасці выступлення "Беларускіх песняроў" ці Аляксандра Кацікава сольна…

## Пад заслону

Наогул, "канцэртная галіна" — гэта тое, чым мясцовыя работнікі культуры ганарацца. Не паспеў я яшчэ да канца сфармуляваць пытанне, за што радуецца сэрца ў супрацоўнікаў аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Астравецкага райвыканкама, як намеснік яго начальніка Кацярына Лянкевіч стала дзяліцца ўражаннямі пра гастролі расійскай спявачкі Ірыны Дубцовай, якія нядаўна прайшлі ў горадзе. А да знакавых, фірмовых мерапрыемстваў у раёне адносяць Міжнародны фестываль "Песня памежжа".

— Чым вылучаецца Астравеччына, — дапаўняе музыкант, — дык гэта яднаннем розных народнасцей, якія пражываюць тут. Адсюль і мноства культур, іх перапляценне, узаемапранікненне, узаемаўзбагачэнне…

Я перадаю Кацярыне Леанідаўне ўражанні з устаноў, паведамляючы (нагадваючы?), што ў ДШМ можа паступіць кожны ахвотны, а ў Цэнтры культуры з наведвальнасцю не ўсё ў парадку, у бібліятэцы ж перад гістарычным пераездам усё роўна варта адрамантаваць хоць бы парадны ўваход. На гэта ў аддзеле дадалі і сваю жменю праблем. Раён (па меншай меры, гэты, узяты асобна) "задушылі планам выканання платных паслуг", якія выцягваюць ледзь-ледзь, па большай частцы — за кошт... канцэртаў поп-выканаўцаў. У такой пагоні за зарабляннем грошай воляй-няволяй менш часу надаецца аўтэнтыцы, традыцыям… Што можа адбыцца далей, мне вам тлумачыць не трэба. "Усіх грошай на культуру з яе ж дапамогай не заробіш" — гэтую фразу, пачутую ў райвыканкаме, я вылучыў для сябе чырвоным колерам. І шчыра паспачуваў чыноўнікам на месцах. Ну а культуры спачуваць — гэта адзін з маіх прамых абавязкаў…

## Класік не мае рацыі!

— Як сказаў нехта з мудрых (магчыма, Канфуцый, а яшчэ ёсць меркаванне, што падобныя словы прамовілі Агата Крысці, Эрнэст Хэмінгуэй. — **А.К.**): "Ніколі не вяртайцеся туды, дзе вы былі шчаслівыя..." Астравец — гэта адваротны для мяне выпадак, — завочна спрачаецца Кацікаў з мудрацом па дарозе ў Мінск. — Я заўсёды з вялізным задавальненнем вяртаюся сюды. Гэта зямля маіх бацькоў, маіх сяброў, з ёй звязаны лепшы перыяд майго жыцця. Часам задумваюся пра тое, што можна было б тут купіць домік на хутары, але жонка не пагаджаецца. А культура... Лепшы беларускі блюзавы гітарыст Леанід Вярэніч неяк сказаў: "І што гэтая музыка заходняя? Сапраўдная музыка — гэта "А я лягу-прылягу..." Мы тады з яго смяяліся, а зараз я разумею, што ён меў рацыю. І хто заўгодна можа мне казаць, што ў Англіі, Францыі ды іншых краінах культура і больш старажытная, і куды багацейшая, і цікавейшая, а я сцвярджаю, што багацейшая, цікавейшая, больш гарманічная — наша! І ў Астраўцы яна якраз такая. Якая б ні была наша культура, хто б і як яе ні крытыкаваў, сваёй адстароненасцю яна нібыта абаронена ад многіх рэчаў, якія размываюць культурную ідэнтычнасць, што адбываецца дзе-нідзе на Захадзе. Нам бы яшчэ навучыцца сваю культуру захоўваць з розумам, развіваць яе і, вядома, інтэграваць са здаровым сусветным культурным працэсам. Але інтэграваць яе туды ўсё ж трэба вельмі асцярожна... К

---

роўневага ўспрымання мастацтва) акадэміка Ігара Мацієўскага, даследаваннях нарацыі і інканціравання фальклору беларуска-польскага этнамузыколага і лінгвіста Галіны Кутыровай-Чубалі, канцэпцыі арганізацыі інтэрактыўных фольк-імпрэз літоўкі Ірыны Урбанавічэне. Для папулярызацыі іх досведу БДУКіМ і праводзіць штогод канферэнцыю па аўтэнтычным фальклоры.

**— Кантакт з носьбітамі, інтэрактыўнасць аўтэнтычных фальклорных форм — ці не застанецца гэта чарговым эксклюзіўным прыгожым заклікам, які не мае масавага практычнага ўвасаблення?**

**Т.П.:** — У практычнай частцы канферэнцыі прайшлі тры мерапрыемствы, скіраваныя на папулярызацыю фальклору. 24 красавіка ў БДУКіМ адбыўся этнаграфічны канцэрт з удзелам народнага фальклорнага ансамбля "Таняжанка" вёскі Тонеж Лельчыцкага раёна і аўтэнтычных гуртоў вёсак Камень, Парэчча, Церабень Пінскага раёна. 25 красавіка ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту быў праведзены абрад "Юр'я" з удзелам аўтэнтычнага ансамбля "Міжрэчча" вёскі Пагост на Тураўшчыне (іх варыянт юр'еўскага абраду ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь) і дзевяці маладзёжных ды дзіцячых фальклорных гуртоў. 26 красавіка зладзілі інтэрактыўную вечарыну дударскай музыкі з удзелам амаль 150 прадстаўнікоў студэнцкай моладзі, якія вывучаюць ды пераймаюць рэпертуар і стыль выканання спеўнага ды харэаграфічнага фальклору.

**Э.Д.:** — Па аднадушным перакананні ўдзельнікаў канферэнцыі, правядзенне апошняй — якасны крок да сістэмнай працы па адраджэнні культурнай памяці нашага народа, адаптацыі традыцыйных каштоўнасцей Беларусі да сучаснасці. І арганізуючым цэнтрам такой работы ў краіне паступова становіцца наш універсітэт, што, дарэчы, і адзначыў яго рэктар Юрый Бондар, калі ўрачыста адкрываў "Аўтэнтычны фальклор".

**Чэслаў ВОХАЎ**

---

фотафакт

# "Viva Commedia" ля Ратушы



Па ў выкананні артыста Горкаўскага тэатра Паўла Еўтушэнкі.



Удзельнікі спектакля "Viva Commedia" пад час рэпетыцыі ля Ратушы.

28 красавіка на сталічнай плошчы Свабоды адбылася тэхнічная рэпетыцыя спектакля Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Максіма Горкага "Viva Commedia". Саму ж пастаноўку можна будзе пабачыць вечарам 1 мая ў рамках адкрыцця Трэцяга Мінскага форуму вулічных тэатраў, які будзе доўжыцца да 3-га мая. У ім прымуць удзел артысты з Беларусі, Польшчы, Прыднястроўя, Расіі і Францыі.

Фота Аліны САЎЧАНКА

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ